Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

**Кафедра рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій**

# ГІСТОРЫЯ КНІГІ І ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ

**Праграма і метадычныя ўказанні па выкананні кантрольных работ для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа» завочнай формы навучання**

Мінск 2011

УДК 002.2(075.4)
ББК 76.11я7
Г 51

Разгледжаны і рэкамендаваны да выдання рэдакцыйна-выдавецкай радай універсітэта.

А ў т а р - с к л а д а л ь н і к
*У. І. Кулікові*ч

Р э ц э н з е н т
кандыдат філалагічных навук, рэдактар, член рэдкалегіі
часопіса «Роднае слова», дацэнт кафедры замежнай літаратуры
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
*М. В. Трус*

По тэматычным плане выданняў вучэбна-метадычнай літаратуры ўніверсітэта на 2011 год. Паз. 120.

Для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа» завочнай формы навучання.

© УА «Беларускі дзяржаўны
тэхналагічны ўніверсітэт», 2011

# ПРАДМОВА

Гісторыя кнігі і выдавецкай справы – вучэбная дысцыпліна, якая ўваходзіць у комплекс спецыяльных прадметаў у сістэме падрыхтоўкі рэдакцыйна-выдавецкіх кадраў і спецыялістаў паліграфічнай вытворчасці па спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа».

Актуальнасць дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю азнаямлення студэнтаў з гісторыяй кнігі як геніяльнага вынаходства чалавецтва, з гісторыяй выдавецкай справы ў працэсе развіцця грамадства. Змест дысцыпліны непасрэдна звязаны з кнігазнаўствам, бібліяграфіяй, гісторыяй беларускай і сусветнай літаратуры, рэлігіязнаўствам, з эканамічнымі і тэхнічнымі пытаннямі кнігавыдавецкай справы.

Паколькі кніга па-ранейшаму займае важнае месца сярод сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі, змест дысцыпліны ахоплівае не толькі вывучэнне функцыянальнай ролі кнігі на розных этапах грамадскага развіцця, але і ўключае ў сябе звесткі пра развіццё пісьменнасці, пра розныя формы кнігі, спосабы яе вырабу і распаўсюджвання, гісторыю фарміравання выдавецкай практыкі ў розных палітычных і культурных умовах.

***Мэта вывучэння дысцыпліны*** – даць студэнтам навуковыя веды па гісторыі кнігі і выдавецкай справы ў працэсе развіцця грамадства.

***Задачы дысцыпліны:***

– асэнсаваць асноўныя заканамернасці развіцця сусветнай рэдакцыйна-выдавецкай справы;

– сфарміраваць тэарэтычныя і практычныя веды ў галіне гістарычнага развіцця кнігі;

– паказаць міждысцыплінарныя сувязі гісторыі кніжнай справы з іншымі дысцыплінамі;

– выпрацаваць у студэнтаў прафесійныя навыкі для павышэння рэдакцыйна-выдавецкай і афарміцельскай культуры выданняў;

– прасачыць сацыяльнае і культурнае асяроддзе, у якім стваралася і функцыянавала кніга, змяняўся яе рэпертуар, тэматычны змест;

– даць уяўленне пра знакамітых дзеячаў кнігі і найбольш значныя помнікі сусветнай і беларускай кніжнай культуры.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны ***ведаць***:

– тэарэтычныя канцэпцыі паняцця «гісторыя кнігі»;

– асноўныя этапы развіцця і вывучэння гісторыі сусветнай кніжнай культуры;

– склад і структуру аб’екта гісторыі кнігі;

– сістэму кнігазнаўчых і параўнальна-тыпалагіных метадаў даследавання;

– творчую спадчыну найбольш знакамітых сусветных і беларускіх дзеячаў выдавецкай справы;

***умець:***

– выкарыстоўваць сістэму спецыяльных метадаў даследавання;

– працаваць з рознымі формамі кнігі ў працэсе кнігавытворчасці, кнігараспаўсюджвання;

– аналізаваць кнігі ў сістэме паняццяў «рукапісная», «рэдкая кніга», «старадрукі».

Структура дысцыпліны «Гісторыя кнігі і выдавецкай справы» пабудавана з улікам дзвюх абавязковых складовых частак для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа»:

– курса лекцый, які раскрывае тэарэтычныя аспекты прадмета вывучэння ў параўнальна-тыпалагічным плане;

– лабараторных заняткаў для павышэння ўзроўню кнігазнаўчага метаду даследавання.

На засваенне матэрыялу дысцыпліны вучэбным планам прадугледжана 100 гадзін, з іх 16 – аўдыторных, у тым ліку 8 гадзін лекцыйных і 8 гадзін лабараторных заняткаў.

## Прыкладны тэматычны план дысцыпліны

| Назвы тэм | Лекцыі | Лабараторныя заняткі |
|---|---|---|
| Гісторыя кнігі і кніжнай справы як галіна кнігазнаўства | 2 | 2 |
| Узнікненне і развіццё пісьменства | 2 | 2 |
| Кнігадрукаванне ў Еўропе (XV–XX стст.) | 2 | 2 |
| Кніжная справа ў Беларусі (XVI–XX стст.) | 2 | 2 |

# МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ І РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАНАННІ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ

● Кожная кантрольная работа складаецца з 25 тэставых заданняў (частка А – 20 і частка Б – 5).

● Для выканання заданняў неабходна выкарыстоўвайць прапанаваную літаратуру.

1. Кожны студэнт самастойна выконвае кантрольную работу і дасылае яе ва ўніверсітэт ва ўстаноўленыя тэрміны.

2. Работа павінна быць выканана на беларускай мове і адпавядаць указаным патрабаванням да зместу і афармлення.

3. Калі работа не выканана ва ўстаноўлены тэрмін і не адпавядае патрабаванням да зместу і афармлення, яна вяртаецца студэнту без праверкі.

4. Пры атрыманні праверанай работы студэнт знаёміцца з заўвагамі і аналізуе (выпраўляе) указаныя недахопы.

5. Выпраўленую кантрольную работу студэнт павінен мець пры сабе на заліку.

6. Студэнт, які выканаў кантрольную работу на 3 (тры) балы і ніжэй, да заліку не дапускаецца.

## Структура кантрольная работы

Кантрольная работа павінна ўяўляць сабой звярстаную брашуру фарматам $60 \times 84^{1}/_{16}$ (або іншым, зручным для вас фарматам), змацаваную сашчэпкай.

***Кантрольная работа павінна ўключаць:***

1. Тытульны ліст, аформлены па ўзоры.
2. Адварот тытульнага ліста, аформлены па ўзоры.
3. Змест.
4. Запоўнены бланк адказаў.
5. Каментарыі і тлумачэнні да адказаў.
6. Спіс выкарыстанай літаратуры.

## Крытэрыі ацэнкі кантрольнай работы

Кожнае правільна выкананае і пракаменціраванае заданне ацэньваецца 4 (чатырма) баламі, якія размяркоўваюцца наступным чынам:

– ***частка А*** – **1 бал** за ўсе правільныя адказы, адзначаныя ў бланку адказаў **+ 3 балы** за правільны і поўны (без памылак – арфаграфічных, граматычных, пунктуацыйных) каментарый;

– ***частка Б*** – **4 балы** за поўнасцю выкананае заданне налічваецца.

**Узор афармлення тытульнага ліста і адварота**

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»

Кафедра рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій

Кантрольная работа № 1
Варыянт 1 (2, 3)
па дысцыпліне

**«ГІСТОРЫЯ КНІГІ
І ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ»**

Выканаў(ла) студэнт(ка)
III курса спецыяльнасці
1-47 01 01 «Выдавецкая справа»
факультэта завочнага навучання

______________________________
(*Прозвішча, імя, імя па бацьку*)

Праверыў
дацэнт кафедры РВТ

______________________________

Мінск 2011

**Заўвагі рэцэнзента:**

**Узор афармлення зместу і бланка адказаў**

## ЗМЕСТ


Бланк адказаў ...................................................... 4

Частка А ...................................................... 4

Частка В...................................................... 5

Каментарыі і тлумачэнні да адказаў ............ 5

Спіс выкарыстанай літаратуры..................... 6


## БЛАНК АДКАЗАЎ

| Прозвішча, імя, імя па бацьку | Курс, група | Колькасць балаў | Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | |

### Частка А

| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А1.** | | | | | | **А11.** | | | | | |
| **А2.** | | | | | | **А12.** | | | | | |
| **А3.** | | | | | | **А13.** | | | | | |
| **А4.** | | | | | | **А14.** | | | | | |
| **А5.** | | | | | | **А15.** | | | | | |
| **А6.** | | | | | | **А16.** | | | | | |
| **А7.** | | | | | | **А17.** | | | | | |
| **А8.** | | | | | | **А18.** | | | | | |
| **А9.** | | | | | | **А19.** | | | | | |
| **А10.** | | | | | | **А20.** | | | | | |

### Частка Б

*Адказы на прапанаваныя пытанні запісваюцца поўнасцю.*

Заданне *часткі А* лічыцца выкананым поўнасцю, калі правільна адзначаны адказы на бланку адказаў і ёсць адпаведны каментарый у раздзеле «Каментарыі і тлумачэнні да адказаў».

| Набраныя балы | Адзнака |
|---|---|
| 96–100 балаў | 10 (*дзесяць*) |
| 91–95 балаў | 9 (*дзевяць*) |
| 86–90 балаў | 8 (*восем*) |
| 81–85 балаў | 7 (*сем*) |
| 76–80 балаў | 6 (*шэсць*) |
| 70–75 балаў | 5 (*пяць*) |
| 65–69 балаў | 4 (*чатыры*) |
| 60–64 балы | 3 (*тры*) |
| 55–59 балаў | 2 (*два*) |
| 50–54 балы | 1 (*адзін*) |

# ПРАГРАМА КУРСА «ГІСТОРЫЯ КНІГІ І ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ»

## Тэма 1
## Гісторыя кнігі і кніжнай справы як галіна кнігазнаўства

Аб'ект, прадмет і метады даследавання гісторыі кнігі і выдавецкай справы. Азначэнне паняцця «гісторыя кнігі», рэтраспектыўнае развіццё гэтага тэрміна. Розныя пункты гледжання на дэфініцыю. Гісторыя кнігі як адна са складовых частак кнігазнаўства. Асноўныя задачы, грамадскае прызначэнне і прадмет навукі пра кнігу. Навуковая тэрміналогія і паняційны апарат, праблемы ўніфікацыі. Метады даследавання (функцыянальны, бібліяграфічны, тыпаграфскі, аналітыка-тэматычны, кнігазнаўчы і інш.).

Асноўныя галіны гісторыі кнігі і выдавецкай справы: паліграфічная справа, кніжны гандаль, бібліятэчная справа, бібліяграфічная справа, рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць.

Асноўныя этапы вывучэння гісторыі кнігі. Перыядызацыя. Пытанні тэорыі і гісторыі кнігі і кніжнай справы ў працах дзеячаў сусветнай культуры XVI ст.: Іагана Арнольда Бергеля, Анры Эцьена і іншых, а таксама ў працах рускіх і беларускіх даследчыкаў (М. І. Новікава, В. С. Сопікава, В. Ластоўскага, Я. Карскага, У. Пічэты, Г. Галенчанкі, А. Мальдзіса, М. Батвінніка і інш.).

## Тэма 2
## Узнікненне і развіццё пісьменнасці

Асноўныя этапы развіцця пісьма. Класіфікацыя сістэм пісьма (піктаграфічная, ідэаграфічная і інш.). Пісьмо і кніга. Матэрыялы для пісьма.

Кніга ў антычным грамадстве. Візантыйская рукапісная кніга. Рукапісныя кнігі народаў Старажытнага Усходу. Лацінская рукапісная кніга.

## Тэма 3
## Славянская рукапісная кніга

Славянскія кірылаўскія рукапісныя кнігі. Цэнтры кніжнай справы і распаўсюджванне кнігі Старажытнай Русі. Стараславянскія рукапісныя

кнігі (XI–XIII стст.) – помнікі рускай, украінскай і беларускай культуры. Распаўсюджванне кірылічнага пісьма. Матэрыялы і форма старажытнарускай рукапіснай кнігі. Тыпы почыркаў кніжнага пісьма: *устаў, паўустаў, скарапіс, вязь*. Тэматыка і асаблівасці афармлення старажытнарускай кнігі. Помнікі старажытнарускай рукапіснай кнігі: Саввіна кніга, Астрамірава Евангелле, Архангельскае Евангелле, Ізборнікі Святаслава 1073 і 1076 гг. Адраджэнне кніжнай справы на Русі ў канцы XIV–XV стст. Кнігапісанне на паўночным усходзе Русі, у Маскве ў XIII–XV стст. Летапісанне. Колькасная характарыстыка.

Беларуская рукапісная кніга XI–XX стст. Развіццё пісьменнасці на беларускіх землях. Цэнтры кніжнай справы. Матэрыялы і прылады працы. Афармленне рукапіснай кнігі, почырк. Еўфрасіння Полацкая і Кірыл Тураўскі. Жанры і змест рукапісных кніг: царкоўная і свецкая літаратура. Тураўскае Евангелле, Аршанскае Евангелле, Полацкае Евангелле, Супрасльскі рукапіс.

Помнікі дзелавой пісьменнасці. Літоўская Метрыка. Свецкая і рэлігійная кніга на царкоўнаславянскай, лацінскай і польскай мовах на тэрыторыі Беларусі. Цэнтры кніжнай справы Беларусі. Лаўрышаўскае, Друцкае, Шарашэўскае Евангеллі. Матэрыялы, афармленне і почырк беларускай рукапіснай кнігі. Мацвей Дзясяты. Сінодыкі, дыярыушы. Патрыстычная і агіяграфічная кніга. Агульнаславянскія летапісныя зводы: Іпацьеўскі, Лаўрэнцьеўскі, Радзівілаўскі летапісы. Беларускае летапісанне: Полацкі, Супрасльскі, Смаленскі летапісы, Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх. Беларускія хронікі: Быхаўца, Сурты-Трубніцкага. Яўрэйская рукапісная кніга. Беларуская кніга арабскай графікі (кітабы). Стараверніцкая рукапісная кніга.

## Тэма 4
## Пачатак кнігадрукавання у Еўропе (XV–XVI стст.)

Сацыяльна-культурныя і тэхнічныя перадумовы ўзнікнення кнігадрукавання. Распаўсюджванне кнігадрукавання ў Заходняй Еўропе ў XV ст. Пачатак славянскага кнігадрукавання. Пачатак усходнеславянскага кнігадрукавання. Кнігавыдавецкая справа Заходняй Еўропы ў XVI ст. Знакамітыя тыпографы і выдавецкія фірмы Еўропы ў XVI ст. З’яўленне выдавецкіх фірм. Кнігі тыпаграфіі Н. Джунта ў Італіі, Эцьенаў і Эцьена Дале ў Францыі, К. Плантэна ў Нідэрландах,

І. Фрабэна ў Швейцарыі. «Biblia Polyglotta». Уздзеянне Рэфармацыі на кнігавыдавецкую справу. Біблія М. Лютэра.

## Тэма 5
## Кнігадрукаванне ў Маскоўскай дзяржаве і на Украіне ў XVI–XVII стст.

Пачатак кнігадрукавання ў Маскве: дзейнасць першадрукароў І. Фёдарава і П. Мсціслаўца. Пераемнікі І. Фёдарава. Пачатак кнігадрукавання на Украіне. Брацкае кнігадрукаванне на Украіне. Кнігадрукаванне лацінскім шрыфтам. Пачатак кнігадрукавання ў Кіеве і Чарнігаве. Перасовачныя тыпаграфіі на Украіне.

Маскоўскі Друкарскі двор у канцы XVI – пачатку XVII ст. Кнігадрукаванне ў Маскоўскай дзяржаве ў сярэдзіне і канцы XVII ст.

## Тэма 6
## Кніжная справа на беларускіх землях ў XVI–XVII стст.

Пачатак кнігадрукавання. Сацыяльна-культурныя прычыны развіцця кнігадрукавання. Асноўныя напрамкі дзейнасці. Паняцце «нацыянальная кніга», «нацыянальны дакумент». Кнігадрукаванне ў другой палове XVI ст. Выданні Брэсцкай тыпаграфіі. Дзейнасць Б. Ваявудкі, С. Мурмеліуса, К. Базіліка. Брэсцкая Біблія. Рэфармацыйны рух на тэрыторыі Беларусі. Пратэстанцкія тыпаграфіі. Нясвіжская тыпаграфія. Выдавецкая дзейнасць С. Буднага і В. Цяпінскага.

Кірылічнае кнігадрукаванне. Выдавецкая дзейнасць П. Мсціслаўца і братоў Мамонічаў у Вільні. Рэпертуар выданняў, афармленне. Брацкае кнігадрукаванне. Паліграфічныя матэрыялы.

Кнігадрукаванне ў сярэдзіне XVII ст. Дзейнасць С. Собаля. Тэматыка і афармленне кніг. Куцеінская тыпаграфія. Брацкія выданні. Выкарыстанне гравюры на медзі.

Кнігадрукаванне лацінскім шрыфтам. Уплыў каталіцкай царквы на духоўнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага. Асноўныя напрамкі кнігавыдання лацінскім шрыфтам. Акадэмічная тыпаграфія ў Вільні. Тыпаграфіі ў Ашмянах і Любчы. Слуцкая тыпаграфія. Гравюры М. Вашчанкі. Тэматыка, мова і афармленне выданняў.

## Тэма 7
## Кніга ў Заходняй Еўропе і Амерыцы (XVII–XVIII стст.)

Кнігадрукаванне ў Нідэрландах. Выдавецкая фірма Эльзевіраў. Тэматыка, афармленне выданняў. Развіццё картаграфічнага кнігавыдання. Выданні «Касмаграфіі» Пталімея. Глобусы. Атласы. Дзейнасць Каралеўскай тыпаграфіі ў Парыжы. С. Крамуазье. Мазарынады – палітычныя памфлеты ў Францыі. Законы аб цэнзуры ў Нідэрландах, Вялікабрытаніі, Францыі. Закон аб аўтарскім праве. Асацыяцыі кнігавыдаўцоў. Выданні Уільяма Блейка. Французская ілюстраваная кніга XVIII ст.

Кнігадрукаванне ў малых краінах Еўропы (Данія, Швецыя, Нарвегія, Чэхія, Польшча). Перыядычны друк. Рэклама ў газетах.

Кнігадрукаванне на амерыканскім кантыненце.

## Тэма 8
## Кніга ў Расіі ў XVIII ст.

Сацыяльна-палітычныя і эканамічныя ўмовы развіцця кнігадрукавання. Дзейнасць Друкарскага двара. Тыпаграфія Я. Тэсінга і І. Капіевіча ў Амстэрдаме. Рэформа друку. Кніга пятроўскага часу. Грамадзянская тыпаграфія В. Купрыянава. Тэматыка і тыпы выданняў. Новы характар і напрамак кніжнай прадукцыі. Першая руская друкаваная газета «Ведомости»: змест, афармленне, распаўсюджванне. Афармленне кнігі. Гравюра на метале. Персоны і куншты.

Скарачэнне кнігадркавання пасля праўлення Пятра І. Пераход дзяржаўных тыпаграфій да выпуску ведамасных выданняў, апісанняў прыдворных урачыстасцей. Пачатак выдавецкай дзейнасці Акадэміі навук, М. В. Ламаносава. Выданне прац рускіх вучоных. Тэматыка і мова выданняў. Газета «Санкт-Петербургские ведомости», «Месячные исторические, генеалогические и географические примечания в Ведомостях». Росквіт глыбокага друку. Кніжная ілюстрацыя. Майстры кніжнага афармлення І. і А. Зубавы, І. Сакалоў. З'яўленне першых кніжных лавак.

Капіталістычныя адносіны ў Расіі. Развіццё мануфактурнай вытворчасці. Развіццё асветы. Адкрыццё Маскоўскага ўніверсітэта і яго роля ў развіцці кнігавыдавецкай справы. Арганізацыя Вольнага эканамічнага таварыства. Указ 1783 г. аб вольных тыпаграфіях. Узмацненне

цэнзуры. Указ 1796 г. аб забароне вольных тыпаграфій. З'яўленне прыватных тыпаграфій. Перыядычны друк. Развіццё журналістыкі. Сатырычны друк.

## Тэма 9
## Кніга на беларускіх землях
## ў XVIII ст.

Сацыяльна-культурнае становішча Беларусі. Крызіс кірылічнага кнігадрукавання. Тыпы тыпаграфій: царкоўныя, прыватныя, дзяржаўныя. Супрасльская тыпаграфія і развіццё ўніяцкага кірылічнага кнігадрукавання. Выдавецкая дзейнасць тыпаграфіі Калегіі іезуітаў у Полацку. Прыватныя тыпаграфіі ў Гародні, Капылі, Шклове, Слоніме; дзяржаўныя (губернскія) у Віцебску, Менску; Каралеўская тыпаграфія у Гародні. Тэматыка выданняў. Перыядычныя выданні. Календары. Мастацкае афармленне кнігі.

Брацкае кнігадрукаванне. Кнігавыдавецкая дзейнасць Магілёўскай брацкай друкарні (рэпертуар, тэматыка, афармленне, мова выданняў). Максім Вашчанка – мастак, гравёр, тыпограф. Мастакі-гравёры Васіль Вашчанка і Фёдар Ангілейка. Магілёўская кніжная графіка. Гравюра на метале і ксілаграфія. Пачатак кнігадрукавання для стараабрадцаў у Магілёўскай брацкай тыпаграфіі. Стараабрадчыя кнігі з магілёўскімі выхаднымі дадзенымі. Паліграфічнае афармленне кніг.

Кнігадрукаванне для стараабрадцаў у канцы XVIII – пачатку XIX ст. Гісторыя стараабрадніцтва на беларускіх землях. Адрозненне стараабрадніцкіх выданняў ад праваслаўных і ўніяцкіх. Арыентацыя ў выдавецкай тэматыцы на маскоўскія даніканаўскія выданні. Друкаванне стараабрадніцкіх кніг ва ўніяцкіх тыпаграфіях (тыпаграфіі Троіцкага манастыра ў Вільні, Благавешчанскага ў Супраслі) і ў Гродзенскай Каралеўскай друкарні. Выхадныя звесткі ў стараабрадніцкіх кнігах. Рукапісная стараабрадніцкая кніга.

## Тэма 10
## Кніга ў Заходняй Еўропе
## ў XIX–XX стст.

**Заходнееўрапейская кніга XIX ст.** Тэхнічны прагрэс у галіне тэхнікі і кнігадрукавання. Выраб паперы. Луі Рабер і вытворчасць паперы механічным спосабам. Вынаходніцтва хуткадрукавальнай машыны.

Томас Б'юік і вынаходніцтва тарцовай гравюры. Гравюра на сталі. Змяншэнне сабекошту кніжнай прадукцыі. Кніжная справа ў Францыі.

Стварэнне буйных універсальных выданняў. Выдавецтва Макмілан у Англіі. Лейпцыгскія фірмы Маер і Бракгаўз. Лейпцыгскі выдавец А. Ф. Рэклам. Серыя «Універсальная бібліятэка». Выдавецтва «Ларусс» у Францыі і выданне «Вялікага ўніверсальнага слоўніка». Вынаходніцтва ратацыйнай машыны У. Булака. Лінатыпія. Монатыпія. Ілюстрацыя ў кнізе. Рэпрадукцыйная тэхніка Ф. Жыло. Аўтатыпія. Фотамеханічная паглыбленая гравюра: геліягравюра, мецатынта. Фоталітаграфія. Мастак кнігі Г. Дарэ. Грамадскі дзеяч, пісьменнік, мастак кнігі У. Морыс. З'яўленне аматарскіх тыпаграфій.

**Бібліяфільская кніга.** З'яўленне таварystваў аматараў кнігі ў Англіі і Францыі. Змест паняцця «бібліяфільства».

## Тэма 11
## Кніга ў Расіі
## ў XIX – пачатку XX ст.

Цэнзура і заканадаўства аб друку. Адмена ўказаў, якія абмяжоўваюць прыватнае прадпрымальніцтва ў тыпаграфскай справе. Прафесіяналізацыя пісьменніцкай працы. Пашырэнне дзейнасці прыватных камерцыйных выдавецтваў І. М. Глазунова, С. І. Селіваноўскага.

Узнікненне выдавецтваў А. П. Плюшара, В. А. Плавільшчыкава, І. В. Сленіна. Выдавецкая дзейнасць А. Ф. Смірдзіна. Увядзенне літаратурнага ганарара. Выдавецкая дзейнасць дваранскіх мецэнатаў. Гурток М. П. Румянцава. Выдавецтва П. П. Бекетава. Літаратурна-выдавецкая дзейнасць дзекабрыстаў. Альманахі дзекабрыстаў «Полярная звезда» и «Мнемозина». Выдавецкая дзейнасць Акадэміі навук, навуковых таварystваў і прыватных выдаўцоў. Выданне лубачнай літаратуры. Перыядычны друк. Заснаванне «Губернских ведомостей». Часопісы «Современник» і «Отечественные записки». Тэхнічныя навінкі ў тыпаграфскай справе. Літаграфія. Гравюра на дрэве. Майстры гравюры на метале: С. Ф. Галакціёнаў, Н. І. Уткін. Мастакі-графікі В. Ф. Цім, А. А. Агін.

Развіццё прамысловага капіталізму ў паліграфічнай вытворчасці і кнігавыдавецкай справе. Стан выдавецкай справы і друку напярэдадні рэформы 1861 г. Цэнзурная рэформа 1865 г. Судзебныя працэсы па справах друку. З'яўленне ўніверсальных выдавецтваў капіталістычнага

тыпу. Стварэнне вольнага рускага друку за мяжой. Арганізацыя А. І. Герцэнам Вольнай рускай тыпаграфіі ў Лондане. «Полярная звезда», «Колокол». Узнікненне нелегальных тыпаграфій у Расіі «Земля и воля», «Карманная типография», «Великорусс». Падпольныя літаграфаваныя выданні. Нелегальныя тыпаграфіі народнікаў. «Черный передел», Пецярбургская Вольная тыпаграфія. Тэматыка і тыпы выданняў. Рост выпуску кніг па тэхніцы і сельскай гаспадарцы. Лубачная літаратура і «барацьба» з ёй. Перыядычныя выданні. Часопісы «Русское слово», «Дело». Сатырычныя часопісы «Искра», «Свисток». Вытворчасць і афармленне кнігі. Развіццё рэпрадуцыйнай тэхнікі. Мастакі-графікі П. М. Баклеўскі, М. С. Башылаў.

Першая руская рэвалюцыя 1905–1907 гг. і друк. Цэнзура і заканадаўства аб друку. Указ аб цэнзуры 1906 г. Увядзенне ваеннай цэнзуры. Стварэнне буйных акцыянерных выдавецтваў і паліграфпрадпрыемстваў («Товарищество И. Д. Сытина», «Просвещение», «Брокгауз и Ефрон»). Спецыялізацыі выдавецтваў. Дзейнасць асветніцкіх выдавецтваў: В. Н. Паповай, М. А. Малых, Е. Н. Вадавозавай, А. М. Калмыковай, М. і С. Сабашніковых, П. П. Сойкіна. Арганізацыя выдавецтва «Знание». Перыядычны і нелегальны друк: «Искра», «Вперед», «Пролетарий». Тэматыка і тыпы выданняў. Выпуск падпісных выданняў, энцыклапедый, слоўнікаў. Вытворчасць і афармленне кніг. Выдавецкая дзейнасць футурыстаў.

Кастрычніцкая рэвалюцыя і друк. Заканадаўства аб друку. Нацыяналізацыя кніжных запасаў. Арганізацыя і роля Центропечати. Кнігарні творчых саюзаў і кааператыўных выдавецтваў. Выдавецтвы «Прибой» и «Волна». Стварэнне спецыялізаваных кніжных выдавецтваў: «Всемирная литература», Гостехиздат, Литературно-издательское Бюро военных комиссаров ПУРа. Выданне нацыянальнай літаратуры. Прыватныя і кааператыўныя выдавецтвы «Алконост», «Былое», «Огни». Выдавецкая дзейнасць імажыністаў. Перыядычны друк. Вытворчасць і афармленне кнігі.

## Тэма 12
## Кніга на Беларусі ў XIX–XXI стст.

**Кніга на Беларусі ў 1-й палове XIX ст.** Перыядызацыя кнігадрукавання. Паланізацыя, русіфікацыя. Павелічэнне колькасці прыватных тыпаграфій. Яўрэйскія тыпаграфіі Боруха Рома і Зімеля Нахімовіча ў Гародні. Тыпы выданняў і тэматыка. Выданні мінскіх

прыватных выдаўцоў З. Прэса і І. Стэфановіча. Выдаўцы-аўтары І. Легатовіч, К. Цыфенбах. Выданне вучэбнай і навуковай літаратуры, кніг для дзяцей.

**Кніга на Беларусі ў 2-й палове XIX ст.** Кніга паслярэформеннага перыяду. Агульная характарыстыка выдавецкай справы. Мова выданняў. З'яўленне кніг, надрукаваных лацініцай.

**Выданне кніг на беларускай мове ў канцы XIX – пачатку XX ст.** Выданне кніг за межамі Беларусі (Санкт-Пецярбург, Масква). Выдавецкая дзейнасць Эпімах-Шыпілы. Дзейнасць выдавецкіх таварыстваў «Загляне сонца і ў наша аконца» і выдавецтва А. Грыневіча ў Пецярбургу. Серыя «Беларускія песняры». Выданні рэдакцыі газеты «Наша ніва», кнігавыдавецкіх таварыстваў «Наша хата», «Беларускае выдавецкае таварыства» у Вільні. Перыядычны друк. Газета «Северо-западный край». Узнікненне першых легальных газет на беларускай мове «Наша доля», «Наша ніва». Часопісы на беларускай мове: «Лучынка», «Саха», «Крапіва» і інш. Крызіс паліграфічнай прамысловасці ў гады Першай сусветнай вайны.

**Кніга на Беларусі на працягу XX–XXI стст.** Віцебская школа графікі. Дзейнасць М. Дабужынскага, М. Шагала, К. Малевіча ў галіне ілюстравання кнігі. В. Ермалаева і яе ўклад у развіццё ілюстрацыі дзіцячай кнігі. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Выдавецтва «Адраджэнне». Выдавецкая дзейнасць Інбелкульта. Перыядычныя выданні. Кніжныя знакі. Афармленне кнігі.

Кнігавыданне на Беларусі да Вялікай Айчыннай вайны: выдавецтвы, тэматыка кніг. Кнігавыдавецкі комплекс Беларусі ў пасляваенны перыяд. Кнігавыданне ў канцы XX ст.

Дзяржаўныя і прыватныя выдавецкія арганізацыі. Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай галіне ў пачатку XXI ст.

# КАНТРОЛЬНЫЯ РАБОТЫ

## Варыянт 1

### Частка А

**А1.** Адзначце, на якой стадыі развіцця пісьма з'явілася кніга ў сучасным разуменні гэтага паняцця:

1) на стадыі вуснай камунікацыі;
2) на стадыі прадметнага або ўмоўнага пісьма;
3) на стадыі піктаграфічнага пісьма;
4) на стадыі ідэаграфічнага (лагаграфічнага) пісьменства;
5) на стадыі гукавога пісьма.

*Патлумачце, чаму на ранейшых стадыях яна такой не з'яўляецца.*

**А2.** Адзначце, якія алфавіты выкарыстоўваліся для кнігапісання на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XVIII стст.:

1) арабская вязь;
2) кітайскія іерогліфы;
3) кірыліца;
4) лацініца;
5) фінікійскія знакі.

*Укажыце, якія кнігі былі напісаны з выкарыстаннем гэтых алфавітаў.*

**А3.** Адзначце імя і прозвішча англійскага выдаўца XVI ст., які адным з першых стаў друкаваць кнігі не распаўсюджаным на той час гатычным шрыфтам, а больш зручным лацінскім.

1) Роберт Эцьен;
2) Джон Дэй;
3) Хрыстафор Плантэн;
4) Яўхім Карскі;
5) Уільям Шэкспір.

*Запішыце, чым праславіліся астатнія дзеячы.*

**А4.** Адзначце рукапісныя кнігі Беларусі, якія даследчыкі адносяць да біблійных:

1) Апостал;
2) Актоіх;
3) Псалтыр;
4) Трыёдзь;
5) Служэбнік.

*Патлумачце, чаму?*

**А5.** Адзначце імя і прозвішча еўрапейскага першадрукара:

1) Франсуа Рабле;
2) Францыск Скарына;
3) Іван Фёдараў;
4) Іаган Гутэнберг;
5) Эразм Ратэрдамскі.

*Запішыце, чым праславіліся астатнія дзеячы.*

**А6.** Адзначце першы бяспрэчны кніжны помнік Вялікага Княства Літоўскага:

1) Лаўрышаўскае Евангелле;
2) Баркулабаўскі летапіс;
3) Полацкае Евангелле;
4) Жыціе Еўфрасінні Полацкай;
5) Аршанскае Евангелле.

*Сцісла ахарактарызуйце яго.*

**А7.** Адзначце, выданнем якіх кніг праславілася шматлікая галандская дынастыя Эльзевіраў у XVII ст.:

1) рэлігійных;
2) навуковых;
3) мастацкіх;
4) вучэбных;
5) палітычных.

*Запішыце назвы трох кніг гэтых выдаўцоў.*

**А8.** Адзначце імя і прозвішча беларускага гісторыка, якому належыць першае шырокамаштабнае даследаванне па гісторыі кніжнай культуры Беларусі «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» (Коўна, 1926):

1) Вацлаў Ластоўскі;
2) Юрый Лабынцаў;
3) Максім Гарэцкі;
4) Уладзімір Пічэта;
5) Янка Купала.

*Сцісла ахарактарызуйце гэтае выданне.*

**А9.** Адзначце, у якім стагоддзі кнігавыдавец Фрыдрых Кёніг і матэматык Андрэй Баўэр пабудавалі першую хуткадрукавальную машыну, звязаную з паравым рухавіком:

1) XVII ст.;
2) XVIII ст.;
3) XIX ст.;
4) XX ст.;
5) XXI ст.

*Што новага ў кнігавыдавецкай справе адбылося ў гэтым стагоддзі? Запішыце.*

**А10.** Адзначце тое наватарскае, што здзейсніў Ф. Скарына, друкуючы свае кнігі:

1) выдаў на царкоўнаславянскай і беларускай мовах «Евангелле»;
2) першы дакладна адрозніў форму вялікіх і малых літар;
3) выдаў першую кнігу на беларускай мове – «Катэхізіс»;
4) стаў першым славянскім дзеячам кнігі, «які свядома аднёсся да кнігі як да зброі асветы», прызначанай «для ідэйнага ўзбагачэння чалавека, а не для дапамогі богаслужэнню»;
5) упершыню ўвёў у практыку кірылічнага друкавання тытульны ліст з назвай кнігі, імем аўтара і перакладчыка.

*Патлумачце, чаму не ўсе прапанаваныя пункты падыходзяць?*

**А11.** У 1578 г. І. Фёдараў выдаў «Буквар». Адзначце асаблівасці гэтага выдання:

1) выдадзены на стараруской мове;
2) выкарыстоўваўся лацінскі алфавіт;
3) выдадзены на дзвюх мовах – грэчаскай і царкоўнаславянскай;
4) выкарыстоўвалася 6 шрыфтоў: 4 кірылічныя і 2 грэчаскія;
5) выкарыстоўваўся спецыяльны шрыфт – віленскі скорапіс на старабеларускай мове.

*Патлумачце, чаму не ўсе прапанаваныя пункты падыходзяць?*

**А12.** Адзначце першыя ў беларускім кнігадрукаванні кірылічныя выданні прававога характару, якія выпусціла друкарня Мамонічаў:

1) Трыбунал;
2) Катэхізіс;
3) Евангелле вучыцельнае;
4) Канстытуцыя;
5) Статут Вялікага Княства Літоўскага.

*Сцісла ахарактарызуйце іх.*

**А13.** У канцы 60-х гг. XVI ст. на Гродзеншчыне, у маёнтку Рыгора Хадкевіча і на яго сродкі пачала дзейнічаць Заблудаўская друкарня. Адзначце прозвішчы дзеячаў, якія прынялі актыўны ўдзел у яе арганізацыі:

1) С. Будны;
2) І. Фёдараў;
3) П. Мсціславец;
4) Б. Ваявудка;
5) Л. Зізаній.

*Чым праславіліся астатнія дзеячы? Патлумачце.*

**А14.** Адзначце кнігі, якія былі падрыхтаваныя і выдадзеныя ў XVI–XVII стст. брацкімі друкарнямі:

1) «Граматыка славянская» Лаўрэнція Зізанія;
2) «Брэсцкая Біблія» («Радзівілаўская Біблія»);
3) «Лексікон славянароскі» Памвы Бярынды;
4) «Азбука» Івана Фёдарава – першы друкаваны рускі падручнік;
5) «Граматыкі славянскія» Мялеція Сматрыцкага.

*Дзе былі выдадзены астатнія кнігі? Запішыце.*

**А15.** У першай палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі друкарні толькі ў двух гарадах. Адзначце назвы гэтых населеных пунктаў:

1) Менск;
2) Гародня;
3) Магілеў;
4) Пінск;
5) Бярэсце.

*Чаму менавіта ў гэтых гарадах? Патлумачце.*

**А16.** Адзначце беларускія перыядычныя выданні XIX ст.:

1) Гутарка двух суседаў;
2) Мужыцкая праўда;
3) Минский листок;
4) Наша доля;
5) Беларус.

*Патлумачце, чаму не падыходзяць астатнія.*

**А17.** Як вядома, у першай палове XIX ст. на Беларусі дзейнічала група выдаўцоў уласных твораў. Адзначце прозвішчы гэтых дзеячаў:

1) Напалеон Орда;
2) Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч;
3) Францішак Багушэвіч;
4) Уладзіслаў Сыракомля;
5) Станіслаў Манюшка.

*Запішыце, якія творы яны выдалі. Чым праславіліся астатнія дзеячы культуры?*

**А18.** Адзначце два буйныя выдавецтвы, дзе была сканцэнтравана выдавецкая справа БССР у перадваенныя гады (1940–1941):

1) Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР;
2) Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
3) Выдавецтва Акадэміі навук БССР;
4) Беларускае выдавецкае таварыства;
5) выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя».

*Запішыце па 5 кніг, выдадзеных гэтымі выдавецтвамі.*

**А19.** З 2004 г. праводзіцца міжнародны конкурс «Мастацтва кнігі» дзяржаў-удзельнікаў СНД. Адзначце кнігі, якія былі пераможцамі гэтага конкурсу:

1) Бярозкіна Н. Ю. «Гісторыя кнігадрукавання Беларусі» (выд-ва «Беларуская навука»);
2) «Беларускі фальклор» у 2-х тамах (выд-ва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі»);
3) Энцыклапедыя «Рэспубліка Беларусь», т. 1;
4) «Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведкі. Каментарыі» (Беларуская Савецкая Энцыклапедыя);
5) фотаальбом «Чернобыль» (выд-ва «Рифтур»).

*Сканіруйце вокладкі і анатацыі любых пяці кніг, якія былі пераможцамі конкурсу ў іншыя гады.*

**А20.** Адзначце назвы недзяржаўных выдавецтваў сучаснай Беларусі:

1) Аверсэў;
2) Пачатковая школа;
3) Радыёла-плюс;
4) Современная школа;
5) Беларуская навука.

*Выпускам якой літаратуры яны займаюцца? Запішыце ў адпаведнасці з бібліяграфічнымі патрабаваннямі назвы 5 кніг, выдадзеных кожным выдавецтвам за апошні год.*

## Частка Б

**Б1.** Запішыце азначэнне паняцця *«кніга»*, прапанаванае Б. І. Косавым у 2000 г.

**Б2.** Запішыце значэнне наступных тэрмінаў: *антыква, піктаграфія, скрыпторый, сігнет, фаліяцыя.*

**Б3.** Запішыце, як называлася першае віленскае выданне Ф. Скарыны (1522 г.). Сканіруйце і раздрукуйце вокладку. Дайце сціслую характарыстыку гэтага выдання.

**Б4.** Запоўніце табліцу.

| Друкарня (выдавецтва) | Горад, дзе размяшчалася | Назвы трох выдадзеных кніг |
|---|---|---|
| Тызенгаўза, «Каралеўская друкарня» | | |
| Бернарда Ваявудкі | | |
| Спірыдона Собаля | | |
| «Загляне сонца і ў наша аконца» | | |
| Марціна Кухты | | |

**Б5.** Запішыце, якая літаратура па мэтавым прызначэнні складала асноўную прадукцыю расійскіх і беларускіх выдавецтваў перыяду Грамадзянскай вайны (XX ст.). Укажыце дакладныя назвы 10 кніг (брашур).

## Варыянт 2

### Частка А

**А1.** Адзначце, дасягненнем якой цывілізацыі прынята лічыць вынаходніцтва пісьменнасці на гліняных шыльдачках:

1) індзейцаў мая;
2) шумерскай;
3) егіпецкай;
4) грэчаскай;
5) фінікійскай.

*Пісьмова патлумачце.*

**А2.** Адзначце еўрапейскія краіны XVI ст., дзе кнігавыдавецкая справа дасягнула класічнага росквіту:

1) Польшча;
2) Італія;
3) Англія;
4) Францыя;
5) Іспанія.

*Запішыце, у чым гэта праявілася.*

**А3.** Адзначце, як называюцца рукапісныя кнігі XVII–XVIII стст., напісаныя па-беларуску арабскай графікай:

1) Тора;
2) Трыёдзь;
3) Апостал;
4) Аль-Кітаб;
5) Актоіх.

*Запішыце, што азначаюць іншыя тэрміны.*

**А4.** Адзначце рукапісныя кнігі Беларусі, якія даследчыкі адносяць да гімнаграфічных:

1) Актоіх;
2) Мінеі;
3) Ірмалоі;
4) Псалтыр;
5) Трыёдзь.

*Запішыце, што абазначаюць іншыя тэрміны.*

**А5.** Адзначце, у якім стагоддзі ўзнікла еўрапейскае кнігадрукаванне:

1) XII ст.;
2) XIII ст.;
3) XIV ст.;
4) XV ст.;
5) XVI ст.

*У якой краіне і хто быў яго распачынальнікам? Запішыце.*

**А6.** Адзначце, кнігі якіх французскіх аўтараў выдаваліся вялікімі тыражамі ў XVII ст.:

1) Лопэ дэ Вега;
2) Карнэль;
3) Мальер;
4) Сервантэс;
5) Расін.

*Што напісалі астатнія аўтары? Запішыце.*

**А7.** Адзначце, асаблівасці кнігавыдавецкай фірмы Эльзевіраў, якая праіснавала з 1581 па 1712 гг.:

1) стварэнне прыгожага і простага шрыфту для малафарматных выданняў;
2) размяшчэнне на карэньчыку кнігі прозвішча аўтара і назвы выдання;
3) выпуск першай штотыднёвай рэгулярнай газеты «Leipziger Zeitung»;
4) увядзенне незвычайна малых для таго часу фарматаў кніг;
5) выпуск навуковай і вучэбнай кнігі.

*Знайдзіце ў інтэрнэце і прадстаўце дзве вокладкі такіх кніг, сціслa ахарактарызуйце гэтыя выданні.*

**А8.** Адзначце імя і прозвішча пачынальніка славянскага кнігадрукавання:

1) Францыск Скарына;
2) Іван Фёдараў;
3) Швайпольт Фіёль;
4) Спірыдон Собаль;
5) Іаган Гутэнберг.

*Чым праславіліся іншыя дзеячы? Запішыце.*

**А9.** XVIII ст. даследчыкі гісторыі кнігі называюць стагоддзем брашур. Адзначце, як у навуковай літаратуры называюць XIX ст.:

1) стагоддзем рукапіснай кнігі;
2) стагоддзем газет;
3) стагоддзем раманаў;
4) стагоддзем інквізіцыі;
5) стагоддзем кірмашоў.

*Сцісла патлумачце.*

**А10.** Даследчык В. Стасаў назваў віленскія выданні Ф. Скарыны «славянскімі эльзевірамі». Адзначце гэтыя выданні.

1) Апостал;
2) Прытчы Саламонавы;
3) Юдзіф;
4) Плач Ераміі;
5) Малая падарожная кніжка.

*Прадстаўце тытульныя лісты (вокладкі) і сцісла ахарактарызуйце гэтыя кнігі.*

**А11.** Адзначце прозвішчы паслядоўнікаў Ф. Скарыны:

1) М. Гусоўскі;
2) С. Будны;
3) В. Цяпінскі;
4) С. Собаль;
5) І. Фёдараў.

*Чым праславіліся іншыя дзеячы? Запішыце.*

**А12.** Адзначце прадметы, якія ёсць на гравюрным партрэце Ф. Скарыны:

1) пясочны гадзіннік;
2) царкоўны крыж;
3) ксілаграфічныя дошкі;
4) кошыкі і збаны;
5) вілы і граблі.

*Патлумачце, што яны сімвалізуюць?*

**А13.** У 90-я гг. XVI ст. пачала актыўна дзейнічаць Віленская брацкая друкарня. Адзначце вучэбныя кнігі Л. Зізанія, выдадзеныя ў ёй.

1) Лексікон славенороссксій…;
2) Граматыка лацінскай мовы;
3) Азбука;
4) Граматыка славянская;
5) Даведнік па хіміі, або Апісанне лекаў і іх дзеяння.

*Прадстаўце тытульныя лісты (вокладкі) і сцісла ахарактарызуйце гэтыя кнігі.*

**А14.** Адзначце назву кнігі, у якой упершыню ў гісторыі выдавецкай справы на Беларусі быў прыведзены прадметны паказальнік:

1) Нясвіжскі «Катэхізіс» (1562) – першая на Беларусі кніга на беларускай мове, выдадзеная С. Будным;

2) «Брэсцкая Біблія», выдадзеная на польскай мове ў 1563 г. на сродкі Мікалая Радзівіла Чорнага (таму яе іншы раз называюць «Радзівілаўскай Бібліяй»);

3) «Евангелле» В. Цяпінскага, надрукаванае на царкоўнаславянскай і беларускай мовах у 70-я гг. XVI ст.;

4) «Евангелле вучыцельнае» (1569), выдадзенае ў Заблудаўскай друкарні;

5) «Псалтыр з Часасло́ўцам» (1570), выдадзены ў Заблудаўскай друкарні І. Фёдаравым.

*Прадстаўце тытульны ліст (вокладку) і сцісла ахарактарызуйце гэтую кнігу.*

**А15.** Адзначце прозвішчы выхадцаў з Беларусі, якія аказалі значны ўплыў на развіццё кнігадрукавання ў Расіі ў XVII–XVIII стст.:

1) А. Тызенгаўз;
2) М. Вашчанка;
3) К. Каганец;
4) С. Полацкі;
5) Г. Капіевіч.

*Чым праславіліся іншыя дзеячы? Запішыце.*

**А16.** Адзначце характэрныя рысы кнігадрукавання Беларусі ў першай палове XIX ст.:

1) пранікненне ў друкарскую і кнігавыдавецкую справу прыватнага кнігадрукавання;

2) павелічэнне выпуску кніг на рускай мове, змяншэнне колькасці выданняў на польскай, лацінскай, яўрэйскай мовах, друкаванне асобных кніг на беларускай мове;

3) актыўны ўдзел у стварэнні друкарняў буйных літоўска-беларускіх магнатаў (Мікайлай Радзівіл Чорны, Ян Кішка, Рыгор Хадкевіч і інш.);

4) з’яўленне кніг навуковага, навукова-папулярнага і прыкладнога характару па медыцыне, сельскай гаспадарцы, гісторыі, а таксама арыгінальных твораў мастацкай літаратуры;

5) з’яўленне газет і часопісаў, у тым ліку і беларускамоўных («Наша ніва», «Лучынка», «Саха», альманах «Маладая Беларусь»).

*Запішыце імёны трох выдаўцоў гэтага перыяду і сцісла ахарактарызуйце іх выдавецкую дзейнасць.*

**А17.** Адзначце беларускія выдавецкія таварыствы і выдавецтвы, якія дзейнічалі ў пачатку ХХ ст.:

1) выдавецтва «Ураджай»;
2) «Круг беларускі, або Гурток беларускае народнае прасветы»;
3) выдавецтва «Беларуская навука»;
4) выдавецтва «Наша хата»;
5) выдавецтва «Мінчук».

*Прадстаўце тытульныя лісты (вокладкі) і сцісла ахарактарызуйце па два выданні гэтых выдавецтваў.*

**А18.** У якім годзе для ўпарадкавання выдавецкай справы ў рэспубліцы быў створаны Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку?

1) 1933 г.; 3) 1963 г.; 5) 1983 г.
2) 1953 г.; 4) 1973 г.;

*Запішыце асноўныя функцыі гэтага органа кіравання.*

**А19.** Адзначце прозвішчы майстроў, якія пакінулі самы прыкметны след у гісторыі кніжнага мастацтва Беларусі ХХ ст.:

1) А. Кашкурэвіч; 4) В. Славук;
2) Б. Эпімах-Шыпіла; 5) М. Селяшчук.
3) В. Шаранговіч;

*Сцісла ахарактарызуйце іх дзейнасць.*

**А20.** Адзначце назвы дзяржаўных выдавецтваў сучаснай Беларусі:

1) Новое знание; 4) ТэтраСістэмс;
2) Вышэйшая школа; 5) Беларускі Дом друку.
3) Мастацкая літаратура;

*Выпускам якой літаратуры яны займаюцца. Запішыце ў адпаведнасці з бібліяграфічнымі патрабаваннямі назвы 5 кніг, выдадзеных кожным выдавецтвам за апошні год.*

## Частка Б

**Б1.** Запішыце азначэнне паняцця «*кніга*», прапанаванае І. Е. Барэнбаумам у 1977 г.

**Б2.** Устанавіце адпаведнасць паміж тэрмінамі і іх значэннямі.

| | |
|---|---|
| А) палімпсест | 1) зборнік богаслужэбных тэкстаў на кожны дзень тыдня |
| Б) калафон | 2) рукапіс, нанесены на матэрыял для пісьма (часцей за ўсё на пергамен) пасля таго, як з яго счысцілі папярэдні тэкст |
| В) маргіналія | 3) нататка на палях, якая тлумачыць незразумелыя словы; рукапісныя паметы на палях старонкі, зробленыя чытачамі |
| Г) Актоіх | 4) зборнік штодзённых тэкстаў псалмоў і малітваў, якія чытаюцца ў розныя гадзіны дня; выкарыстоўваліся для навучання грамаце |
| Д) Часаслоў | 5) у рукапісных і старадрукаваных кнігах тэкст на апошняй старонцы, які змяшчае назву кнігі, звесткі пра яе аўтара, перапісчыка, месца і час друкавання |

**Б3.** Запішыце, як гісторыкі кнігі называюць:

1) выданні, якія выйшлі ад пачатку кнігадрукавання (1450 г.) да 1.01.1501 г.;

2) кнігі першай паловы XVI ст.

Прадстаўце тытульныя лісты (вокладкі) і сцісла ахарактарызуйце па два выданні кожнага перыяду.

**Б4.** Запішыце, друкарні якіх трох тыпаў у залежнасці ад крыніц фінансавання існавалі на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст.

Прадстаўце тытульныя лісты (вокладкі) і сцісла ахарактарызуйце па два выданні гэтых друкарняў.

**Б5.** Як вядома, ужо ў XIX ст. кнігавыдавецкія фірмы Еўропы імкнуцца да пэўнай спецыялізацыі. Устанавіце адпаведнасць паміж прозвішчамі выдаўцоў і літаратурай, на выпуску якой яны спецыялізаваліся.

| | |
|---|---|
| А) Фрыдрых Бракгаўз | 1) спецыялізаваўся на выданні вялікімі тыражамі недарагіх падручнікаў, даведнікаў для школ |
| Б) Эрнэст Зееман | 2) заснаваў выдавецтва па выпуску даведачнай і энцыклапедычнай літаратуры |
| В) Луі Ашэт | 3) заснавальнік у Парыжы гандлю тэатральнымі выданнямі; буйнейшага выдавецтва навуковай і мастацтвазнаўчай літаратуры |
| Г) Кальман Леві | 4) заснаваў першую ў Германіі спецыялізаваную фірму па выпуску і продажы выяўленчай прадукцыі (рэпрадукцыі карцін, паштовак, альбомаў па мастацтве) |
| Д) П’ер Ларус | 5) філолаг, складальнік слоўнікаў, заснавальнік выдавецтва па выпуску мастацтвазнаўчай літаратуры |

## Варыянт 3

### Частка А

**А1.** Адзначце, з дзейнасцю якіх кнігапісцаў звязана з’яўленне ў Вялікім Княстве Літоўскім на пачатку XVI ст. поўнага збору біблійных тэкстаў:

1) Леў Сапега;
2) Мацвей Дзясяты;
3) Кірыла Тураўскі;
4) архіепіскап Генадзь;
5) дыякан Фёдар.

*Запішыце, чым праславіліся астатнія асобы.*

**А2.** Адзначце імя і прозвішча іспанскага кнігавыдаўца XVI ст., які атрымаў ганаровае званне «архітыпографа» і першым адкрыў свае тыпаграфіі і кніжныя крамы ў Афрыцы і Амерыцы:

1) Хрыстафор Калумб;
2) Джон Дэй;
3) Хрыстафор Плантэн;
4) Эцьен Дале;
5) Джавані Бакачыа.

*Запішыце, чым праславіліся астатнія асобы.*

**А3.** Адзначце катэгорыі, на якія сучасныя даследчыкі падзяляюць рэпертуар рукапіснай кнігі на Беларусі XI–XVIII стст.:

1) богаслужэбныя;
2) князеслужэбныя;
3) чытальныя («чэцці»);
4) пісальныя;
5) ужытковага значэння.

*Патлумачце астатнія тэрміны.*

**А4.** Адзначце, як называюцца біблійныя і агіяграфічныя сюжэты кніг, якія афіцыйна царква не прызнае за праўдзівыя:

1) Актоіхі;
2) Мінеі;
3) Псалтыры;
4) Апокрыфы;
5) Ірмалоі.

*Патлумачце астатнія тэрміны.*

**А5.** Адзначце асаблівасці кнігавыдавецкага дома Альдаў, адкрытага ў Венецыі ў 1490 г., якія праіснаваў больш за 100 гадоў:

1) гэта было першае спецыялізаванае выдавецтва першага паўстагоддзя кнігадрукавання;

2) у тыпаграфіі гэтага выдавецтва ўпершыню адлілі курсіў – шрыфт, падобны да рукапісных дакументаў папскай канцылярыі;

3) тут выйшла знакамітая *42-радковая* (па колькасці радкоў на кожнай з 1284 старонак) Біблія;

4) Альды першымі сталі выпускаць кнігі невялікага фармату (*ін-актава*);

5) Альды першымі сталі выдаваць штотыднёвую газету «*La Gazette*».

*Запішыце іншыя, не названыя, асаблівасці.*

**А6.** Адзначце, у якім горадзе Ф. Скарына заснаваў у 1517–1519 гг. на грошы беларускіх купцоў тыпаграфію і выдаў 23 кнігі Бібліі:

1) Варшава;
2) Прага;
3) Вільня;
4) Менск;
5) Масква.

*Сцісла ахарактарызуйце выдавецкую дзейнасць Скарыны ў гэтым горадзе.*

**А7.** Адзначце, на якой народнай мове ў 1466 г. была выдадзена першая поўная Біблія:

1) нямецкай; 3) чэшскай; 5) англійскай.
2) італьянскай; 4) польскай;

*Сцісла ахарактарызуйце гэтае выданне.*

**А8.** Адзначце, як публіка XIX ст. называла стандартызаваныя кнігі французскага кнігагандляра, якія друкаваліся фарматам 18 градусаў з аднолькавым коштам 3–5 франкаў за асобнік:

1) каналі; 3) шарпанцьеры; 5) старадрукі.
2) покетбукі; 4) кінавары;

*Патлумачце астатнія тэрміны.*

**А9.** Адзначце прозвішчы вядомых еўрапейскіх выдаўцоў XIX ст.:

1) Ф. Бракгаўз; 3) П. Фурнье; 5) П. Ларус.
2) Э. Зееман; 4) Б. Франклін;

*Запішыце, чым праславіліся астатнія асобы.*

**А10.** Адзначце першыя кнігі, выдадзеныя на кірыліцы ў 1490–1491 гг. у Кракаве Швайпольтам Фіёлем:

1) Евангелле; 3) Каран; 5) Псалтыр.
2) Актоіх; 4) Часаслоў;

*Хто такі Фіёль? Сцісла ахарактарызуйце яго дзейнасць.*

**А11.** У канцы XVI ст. сталіца ВКЛ Вільня стала буйнейшым цэнтрам усходнеславянскага кнігадрукавання. Адзначце друкарні, якія працавалі ў гэтым горадзе ў адзначаны перыяд:

1) Заблудаўская друкарня; 4) друкарня Мікалая Радзівіла;
2) друкарня Васіля Цяпінскага; 5) друкарня Васіля Гарабурды.
3) друкарня Мамонічаў;

*Запішыце, дзе і калі працавалі астатнія друкарні.*

**А12.** Станаўленне брацкага кнігадрукавання на Беларусі звязана з этапамі фарміравання і развіцця брацтваў. Адзначце, прадстаўнікі якіх саслоўяў уваходзілі ў гэтыя арганізацыі:

1) шляхты; 3) мяшчанства; 5) духавенства.
2) сялянства; 4) рыцарства;

*Патлумачце чаму?*

**А13.** Адзначце выданні Гродзенскай друкарні ў XVIII ст.:

1) манаграфія «Флора Літвы» французскага натураліста Ж. Жылібера;
2) штогадовы «Каляндар Гаспадарскі» (на польскай мове);
3) падручнік «Лёгкі спосаб навучыцца чытаць па-руску і па-польску»;
4) «Gazeta Grodzienska» («Газета Гродзеньска»);
5) альбом «Выява рода князёў Радзівілаў».

*Дзе была выдадзена астатняя друкаваная прадукцыя? Запішыце.*

**А14.** Адзначце выданні, якія з’явіліся на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.:

1) газета «Наша доля»;
2) газета «Мужыцкая праўда»;
3) «Слоўнік» І. І. Насовіча;
4) «Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией»;
5) зборнік вершаў М. Багдановіча «Вянок».

*Сцісла ахарактарызуйце іншыя выданні.*

**А15.** Адзначце толькі тыя асаблівасці ў развіцці кнігадрукавання, якія з’явіліся ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы ў XIX ст.:

1) з мэтай выцяснення з рынку нізкапробнай літаратуры атрымаў развіццё прынцып серыйнасці выданняў;
2) з мэтай павышэння вытворчасці ў выдавецкай справе з’яўляюцца першыя камп’ютарныя сістэмы;
3) з’яўленне на рынку прыгодніцкай і навукова-фантастычнай літаратуры;
4) з’яўленне першых спецыялізаваных прадпрыемстваў па выпуску дзіцячай і юнацкай літаратуры;
5) з’яўленне літаграфіі – тэхналогіі плоскага друку для вытворчасці ілюстрацый.

*Патлумачце, чаму не падыходзяць іншыя асаблівасці?*

**А16.** У 1907 г. было распачата выданне серыі «Беларускія песняры», у якую ўваходзілі «Дудка беларуская», «Смык беларускі» Ф. Багушэвіча, «Гапон» В. Дуніна-Марцінкевіча, «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча і інш. Адзначце выдавецтва, у якім друкавалася гэтая серыя:

1) Круг беларускі, або Гурток беларускае народнае прасветы;
2) Выдавецтва Антона Грыневіча;
3) Друкарня Марціна Кухты;
4) Наша хата;
5) Загляне сонца і ў наша аконца.

*Што было выдадзена ў іншых выдавецтвах? Запішыце.*

**А17.** Адзначце назву кааператыўнага выдавецтва, якое было створана на сродкі дзяржаўных і грамадскіх установ, асобных дзеячаў культуры ў красавіку 1922 г. Узначальваў яго Ц. Гартны. З канца гэтага года яно называлася «Савецкая Беларусь»:

1) Лучынка; 3) Мінчук; 5) Вясёлка.
2) Адраджэнне; 4) Саха;

*Сцісла ахарактарызуйце дзейнасць іншых выдавецтваў.*

**А18.** Адзначце буйныя выдавецкія арганізацыі, створаныя ў Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны:

1) Выдавецтва Акадэміі навук БССР;
2) выдавецтва «Вясёлка»;
3) Выдавецтва сельскагаспадарчай літаратуры Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР;
4) Вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства культуры БССР;
5) Выдавецтва вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР.

*Якую прадукцыю яны выдавалі? Запішыце.*

**А19.** Гэта быў час найвышэйшага ў XX ст. росквіту беларускай кніжнай графікі, час выхаду айчыннай кнігі на сусветную арэну. Асаблівых поспехаў дасягнулі беларускія мастакі ў афармленні літаратуры для дзяцей. Створанае дзяржаўнае выдавецтва «Юнацтва», сканцэнтравала вопыт беларускай кніжнай графікі ў афармленні мастацкай літаратуры для дзяцей і юнацтва розных узроставых катэгорый. Для мастацтва кнігі гэтага перыяду характэрны праявы яскравага і высокамастацкага пераасэнсавання прагрэсіўных народных традыцый. У кніжнай графіцы знаходзяць найбольш яскравае ўвасабленне ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння.

Адзначце, пра які час ідзе гаворка:

1) 1920 – пачатак 1930-х гг.;
2) 1940–1950 гг.
3) 1960–1970 гг.;
4) 1980 – сярэдзіна 1990 гг.;
5) апошняе дзесяцігоддзе XX ст.

*Запішыце прозвішчы мастакоў і сканіруйце тры працы гэтых аўтараў.*

**Б20.** Адзначце, імя якога пісьменніка мае дзяржаўнае выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя»:

1) імя Якуба Коласа;
2) імя Петруся Броўкі;
3) імя Янкі Купалы;
4) імя Івана Мележа;
5) імя Францыска Скарыны.

*Патлумачце, чаму?*

## Частка Б

**Б1.** Поліэтнічнасць і поліканфесійнасць насельніцтва беларускіх земляў у XIV–XVIII стст. абумовілі выкарыстанне для кнігапісання розных моў і розных алфавітаў. Запішыце гэтыя мовы і алфавіты.

**Б2.** Устанавіце адпаведнасць паміж тэрмінамі і іх значэннямі.

| | |
|---|---|
| А) агіяграфія | 1) старажытная форма размяшчэння тэкстаў Евангелля і Апостала ў паслядоўнасці чытання пры богаслужэнні |
| Б) апракас | 2) зборнік тэкстаў абрадаў, якія патрэбна адпраўляць па-за царквой |
| В) Ірмалой | 3) зборнікі тэкстаў богаслужэнняў не па каляндарным, а па пасхальным цыкле |
| Г) Трэбнік | 4) раздзел царкоўнай літаратуры, прысвечаны апісанню жыцця і пакут людзей, якіх царква залічвае да святых |
| Д) Трыёдзь | 5) зборнік царкоўных спеваў |

**Б3.** Кнігазнаўца В. С. Люблінскі пісаў: «Толькі з гэтага часу кніга набывае той выгляд, які захоўвае да нашых дзён: яна ставіцца на паліцу, у той час, як у ранейшых масіўных пераплётах, у тоўстай скуры, нацягнутай на дубовую дошку, іншы раз з засцежкамі, яна не расстаўлялася, а раскладвалася на стойках». Запішыце:

1) пра які час ідзе гаворка;
2) што паспрыяла таму, што кнігу пачалі ставіць на паліцу;
3) з імем якога парыжскага майстра звязаны гэты элемент кнігі.

**Б4.** Устанавіце адпаведнасць паміж імёнамі выдаўцоў і іх унёскам у развіццё кнігадрукавання:

| | |
|---|---|
| А) Максім Вашчанка | 1) заснаваў першую на сучаснай тэрыторыі Беларусі кірылаўскую друкарню |
| Б) Пётр Кміта | 2) склаў і падрыхтаваў да друку зборнік рэцэптаў «Хатнія лекі» (1616 г.) – першае вядомае медыцынскае выданне на тэрыторыі Беларусі |
| В) Станіслаў Мурмэліус | 3) пад яго кіраўніцтвам у 1707 г. быў адліты новы шрыфт, які атрымаў назву «грамадзянскага» |
| Г) Сымон Будны | 4) надрукаваў канцыянал «Песні хвал боскіх» (1558 г.) Яна Зарэмбы – першы друкаваны нотны зборнік у ВКЛ і адзін з самых ранніх ва Усходняй Еўропе |
| Д) Гальяш (Ілья) Капіевіч | 5) першым у беларускім кірылічным кнігадрукаванні пачаў шырока выкарыстоўваць гравюру на медзі (90-я гг. XVII ст.) |

**Б5.** Запішыце псеўданім аўтара і назву верша, выдадзенага асобнай кнігай у выдавецтве «Мастацкая літаратура» (1983 г.) у перакладзе на восемдзесят дзве мовы свету.

## ЛІТАРАТУРА


***Асноўная***

1. Баразна, М. Р. Мастацтва кнігі Беларусі XX стагоддзя / М. Р. Баразна. – Мінск: Беларусь, 2007. – 239 с.: іл.
2. Баренбаум, И. Е. К вопросу об универсальном определении понятия «книга» // Книга. Исследования и материалы. Сб. 34. – М.: Книга, 1977. – С. 5–13.
3. Бярозкіна, Н. Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н. Ю. Бярозкіна. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 199 с.
4. Владимиров, Л. И. Всеобщая история книги / Л. И. Владимиров. – М.: Наука, 1988. – 345 с.
5. Волк, А. А. Книгоиздательское дело в Белоруссии / А. А. Волк, А. И. Ракович. – Минск, 1982. – 232 с.
6. Выдавецкая справа // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: БелСЭ, 1984. – Т. 1. – С. 687–692.
7. Гісторыя беларускай кнігі: у 2 т. / М. В. Нікалаеў; навук. рэд.: В. В. Антонаў, А. І. Мальдзіс. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1: Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. – 424 с.: іл.
8. Інкунабулы ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі [Электронны рэсурс]: каталог / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад. Н. С. Саверчанка. – Электронныя, тэкставыя, графічныя даныя і праграма (418 Мб). – Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2008. – 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM).
9. История книги: учебник / под ред. А. А. Говорова, Т. Г. Куприяновой. – М.: Светоч, 2001. – 345 с.
10. Кніга Беларусі [Электронны рэсурс]: зводны каталог / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Электронныя, тэкставыя і графічныя даныя. – Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2008. – 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM).
11. Коссов, Б. И. Еще раз об определении понятия «книга» / Б. И. Коссов // Девятая международная научная конференция по проблемам книговедения: тез. докл., Москва, 23–26 апреля. – М.: Наука, 2000. – С. 21–22.
12. Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя; рэдкал. І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1988. – 608 с.: іл.

13. Селиверстова, Н. А. Книжные культуры стран СНГ и Балтии: прошлое и настоящее / Н. А. Селиверстова. – М.: Наука, 2006. – 354 с.
14. Шамракова, М. А. Всеобщая история книги. – 2-е изд., перераб. и доп. / М. А. Шамракова, И. Е. Баренбаум. – СПб.: СПбГУКИ: Профессия, 2008. – 392 с.
15. Энциклопедия для школьников и студентов: в 12 т. / под общ. ред. В. И. Стражева. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1: Информационное общество. XXI век. – 528 с.: ил.

***Дадатковая***

16. Аронов, В. Р. Эльзевиры / В. Р. Аронов. – М., 1975. – 154 с.
17. Вербанец, Н. В. Йохан Гутенберг и начало книгопечатания в Европе: опыт нового прочтения материала / Н. В. Вербанец. – М., 1980. – 237 с.
18. Гессе, Г. Магия книги / Г. Гессе. – М., 1990. – 278 с.
19. Есенькин, Б. С. Предпринимательство в книжном деле: учеб. пособие / Б. С. Есенькин, А. Ф. Коган; Моск. гос. ун-т печати. – М.: МГУП, 2004. – 284 с.
20. Ігнатоўскі, І. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / І. М. Ігнатоўскі; уступ. арт. А. П. Грыцкевіча; камент. і заўвагі Э. Н. Гнеўкі. – 5-е выд. – Мінск: Беларусь, 1992. – 190 с.
21. Истрин, В. А. Развитие письма. / В. А. Істрин. – М.: Изд-во Академии наук СССР, 1961. – 395 с.
22. Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В. Ластоўскі. – Коўна, 1926. – 754 с.
23. Люблинский, В. С. Книга в истории человеческого общества / В. С. Люблинский. – М., 1972. – 324 с.
24. Мечковская, Н. Б. История языка и история коммуникации: от клинописи до Интернета: курс лекций по общему языкознанию / М. Б. Мечковская. – М.: Флинта: Наука, 2009. – 584 с.
25. Нікалаеў, М. Палата кнігапісная. Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях. – Мінск, 1993. – 365 с.
26. Павленко, Н. А. История письма: учеб. пособие для филологических факультетов вузов / Н. А. Павленко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 1987. – 239 с.: ил.

# ЗМЕСТ


ПРАДМОВА ........ 3

МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ І РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАНАННІ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ ........ 5

ПРАГРАМА КУРСА ........ 9

Тэма 1. Гісторыя кнігі і кніжнай справы як галіна кнігазнаўства ........ 9
Тэма 2. Узнікненне і развіццё пісьменнасці ........ 9
Тэма 3. Славянская рукапісная кніга ........ 9
Тэма 4. Пачатак кнігадрукавання ў Еўропе (XV–XVI стст.) ........ 10
Тэма 5. Кнігадрукаванне ў Маскоўскай дзяржаве і на Украіне ў XVI–XVII стст. ........ 11
Тэма 6. Кніжная справа на беларускіх землях ў XVI–XVII стст. ........ 11
Тэма 7. Кніга ў Заходняй Еўропе і Амерыцы (XVII–XVIII стст.) ........ 12
Тэма 8. Кніга ў Расіі ў XVIII ст. ........ 12
Тэма 9. Кніга на беларускіх землях ў XVIII ст. ........ 13
Тэма 10. Кніга ў Заходняй Еўропе ў XIX–XX стст. ........ 13
Тэма 11. Кніга ў Расіі ў XIX – пачатку XX ст. ........ 14
Тэма 12. Кніга на Беларусі ў XIX–XXI стст. ........ 15

КАНТРОЛЬНЫЯ РАБОТЫ ........ 17

Варыянт 1 ........ 17
Варыянт 2 ........ 22
Варыянт 3 ........ 28

ЛІТАРАТУРА ........ 35

# ГІСТОРЫЯ КНІГІ І ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ

Аўтар-складальнік
**Кулíковіч** Уладзімір Іванавіч

Рэдактар *М. А. Юрасава*
Камп'ютарная вёрстка *М. А. Юрасава*

Падпісана да друку 24.02.2011. Фармат $60 \times 84^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,2. Ул.-выд. арк. 2,3.
Тыраж 50 экз. Заказ .

Аддрукавана ў Цэнтры выдавецка-паліграфічных
і інфармацыйных тэхналогій установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».
220006. Мінск, Свярдлова 13а.
ЛИ № 02330/0549423 ад 08.04.2009.
ЛП № 02330/0150477 ад 16.01.2009.